— уменне чуць галасы партытуры;
— здольнасць кантраляваць ход выканання.

Гэты метад дапамагае зразумець функцыю кожнага голасу партытуры, функцыянальныя сувязі паміж галасамі, ролю рытмічнага суправаджэння. Пры мануальным асваенні партытуры метад раздзельнага дырыжыравання дазваляе знаходзіць сродкі "поліфанічнага кіравання" і выяўляць галасы, якія даюць апору для кіравання, пераносіць кіраванне з аднаго голасу на іншыя, ужываць "абагульняльныя жэсты", ужывальныя для ўсіх галасоў.

Метад раздзельнага дырыжыравання можа быць выкарыстаны як сродак самакантролю з мэтай праверкі дакладнасці жэста, знаходжання дэфектаў тэхнікі дырыжыравання, выпраўлення памылак выканання.

Затрачваючы ў пачатку навучання многа часу на набыццё важнага навыку – умення працаваць над творам (партытурай), дырыжор у далейшым будзе мець меншую патрэбу ў дэталёвым штудзіраванні матэрыялу, зможа абмежавацца супастаўленнем тых элементаў, якія ўяўляюцца яму найбольш важнымі для вырашэння канкрэтнай задачы.

*Ляйко Н.А., дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ КУРСА "КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ" У ГРУПАХ СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ СЯРЭДНЮЮ СПЕЦЫЯЛЬНУЮ АДУКАЦЫЮ

У апошнія гады шмат увагі надаецца вырашэнню праблем суадносін вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі не толькі выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, але і практыкамі. У сувязі з сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі зменамі ў нашай рэспубліцы ўсё часцей перад кіраўнікамі бібліятэкі паўстаюць праблемы аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказнасці пры вырашэнні кадравых пытанняў, аб дакладным вызначэнні суадносін пры камплектаванні бібліятэкі спецыялістамі з розным узроўнем прафесійнай кваліфікацыі. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што аб гэтым павінны сведчыць не толькі дыплом аб сярэдняй ці вышэйшай адукацыі, але і галоўнае – веды. Таму падрыхтоўка спецыялістаў у гэтых навучальных установах павінна мець на розных ступенях адпаведную дыферэнцыяцыю. І нягледзячы на тое, што на старонках спецыяльнага перыядычнага друку разглядаліся розныя сітуацыі як у нашай краіне, так і за мяжой, што неаднаразова абмяркоўваліся пытанні на навукова-метадычных і навукова-практычных канферэнцыях, на тое, што надрукаваны не толькі асобныя артыкулы, але і зборнікі навуковых артыкулаў, названая праблема не вырашана і будзе ўзнікаць яшчэ неаднойчы. Аб гэтым сведчыць таксама “круглы стол”, які быў праведзены ў кастрычніку 1997 г. у Беларускім універсітэце культуры, які прысвячаўся праблемам бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі ў Беларусі.

Праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў на ФЗН на базе сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўзнікаюць і на дзённай форме навучання. Між тым ва ўмовах нашага універсітэта трэба ўлічваць тую акалічнасць, што гаварыць аб пераемнасці пры бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі мы маем больш магчымасці на ФЗН, чым на ФБІС. Гэтую перавагу ФЗН атрымаў таму, што там ужо на працягу 6 гадоў ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў у асобных групах на базе сярэдняй спецыяльнай адукацыі са скарочаным тэрмінам навучання.

На сучасным этапе гэтаму пытанню надаецца асаблівая ўвага. Так, на нарадзе прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з рэктарамі вышэйшых навучальных устаноў, праведзенай 15 студзеня 1998 г., падкрэслівалася, што неабходна забяспечыць прыярытэт пры прыёме ў ВНУ лепшым выпускнікам сярэдніх спецыяльных устаноў на скарочаны тэрмін навучання пры ўмове іх паступлення на профільныя факультэты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адпрацаваўшы 6 гадоў у групах студэнтаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, мы маем некаторы вопыт і свой погляд на гэтую праблему. Шчыра кажучы, з'яўленне груп са скарочаным тэрмінам навучання нас вельмі ўзрадавала, таму што на працягу многіх гадоў сярод студэнтаў як дзённай, так і завочнай формаў навучання ўзнікалі пытанні аб рознай падрыхтоўцы, аб індывідуальных заданнях. Выкладчык павінен быў арыентавацца на рознапланавую аўдыторыю, таму што асноўная частка студэнтаў паступіла ва універсітэт пасля школы. Наяўнасць асобных груп са скарочаным тэрмінам навучання дала магчымасць для вырашэння гэтых праблем. У прыватнасці, пры складанні вучэбных планаў у раздзеле "Спецыяльныя дысцыпліны" колькасць іх ва універсітэце значна павялічана. Галоўнае ў тым, што розныя не толькі фармулёўкі дысцыплін, але і напаўненне іх матэрыяламі. Праўда, наконт гэтага існуюць розныя думкі. Некаторыя спецыялісты лічаць, што назвы дысцыплін павінны быць аднолькавымі, а аб'ём часу і вучэбнага матэрыялу – рознымі.

На наш погляд, значна лепш, калі фармулёўкі назваў курсаў розныя. Гэта значна лепш псіхалагічна ўспрымаецца студэнтамі. У гэтым плане курсы "Каталагізацыя дакументаў", "Сістэматызацыя мастацкай літаратуры", "Фондазнаўства", "Бібліятэчна-інфармацыйныя фонды" адрозніваюцца ад назваў аналагічных курсаў "Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў" у Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме імя А.С.Пушкіна. Да гэтага мы прыйшлі ў выніку назапашанага вопыту, на аснове якога ў нас склалася пэўная канцэпцыя.

Так, уступная лекцыя ў гэтых групах пачынаецца не з паведамлення матэрыялу аб ролі курса і яго месцы сярод іншых бібліятэказнаўчых і бібліяграфічных дысцыплін, значэнні курса ў практычнай дзейнасці, а з матэрыялу аб суадносінах курса "Каталагізацыя дакументаў" з курсам "Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў", з выяўлення ведаў студэнтаў па бібліятэчных каталогах, якія яны атрымалі ў каледжы. Неабходна паказаць прынцыповую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

розніцу ў падыходзе да адных і тых жа праблем, да тых пытанняў, якія яны ўжо вывучалі. Зазначым, што рабіць гэта трэба з вялікім тактам, не прыніжаючы ведаў студэнтаў і навучальную ўстанову.

На прыкладзе курса “Каталагізацыя дакументаў” пакажам, як мы вырашаем гэтую праблему. У прыватнасці, пры вывучэнні табліц ББК, нягледзячы на тое, што на іх вывучэнне і сістэматызацыю дакументаў у Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме адведзена пэўная колькасць гадзін і студэнты адносна добра ведаюць табліцы ББК для масавых бібліятэк, ім чытаецца лекцыя, разлічаная на 2 гадзіны, пад назвай “ББК і яе выкарыстанне ў Рэспубліцы Беларусь”. У ёй веды студэнтаў дапаўняюцца 5 варыянтамі ББК, іх характарыстыкай і спецыфікай структуры, дапаўненнямі ББК, новым у ББК, дапрацаваным выданнем ББК для дзіцячых і школьных бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь, распрацоўкай варыянта выкарыстання ББК у аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэмах новага падраздзела “63.3 (4 Беі) Гісторыя Беларусі” і стварэннем рабочых табліц ББК для масавых бібліятэк. У час лабараторных заняткаў мы стараемся навучыць студэнтаў выбіраць класіфікацыйнае рашэнне ў залежнасці ад чытацкага прызначэння дакументаў, а таксама ступені дэталізацыі асноўных табліц. Ім прапануецца растлумачыць розніцу ў ступені дэталізацыі аднаго і таго ж раздзела ў табліцах класіфікацыі для бібліятэк розных тыпаў. Напрыклад, дэталізацыя дзялення “24 Хімія” ў табліцах ББК для абласных, масавых, дзіцячых і школьных бібліятэк. Такім чынам, мы стараемся як мага лепш пазнаёміцца з табліцай, таму што гэта асноўны інструмент сістэматызатара.

Працуючы са студэнтамі гэтых груп, заўважаем, што яны не толькі ўсе працуюць па спецыяльнасці, але ў іх таксама ў адрозненне ад астатніх студэнтаў развіта пачуццё гонару за сваю прафесію, ёсць свая ацэнка прафесійнага майстэрства і патрабаванні да асобы бібліятэкара. Гэтыя студэнты лепш за астатніх усведамляюць, што ім патрэбна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія веды яны могуць выкарыстаць на практыцы. Таму на першай лекцыі разам са студэнтамі абавязкова ўдакладняем тэматычны план курса "Каталагізацыя дакументаў", параўноўваем яго не толькі з планам тэхнікума, але і ўдакладняем веды студэнтаў. На ФЗН праблема па названым курсе заключаецца яшчэ ў тым, што сярод былых выпускнікоў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй былі такія сярод першых набораў, якія закончылі тэхнікум 10-12 гадоў назад. Даводзілася ўдакладняць, па якіх дзяржаўных стандартах яны вучыліся, даваць ім дадатковыя кансультацыі, парады.

На першай лекцыі разам са студэнтамі мы абмяркоўваем не толькі змест курса, але і формы правядзення заняткаў. Студэнты, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, маюць уяўленне аб лекцыях і практычных занятках, ведаюць, як яны праходзяць. Студэнты добра ўспрымаюць новыя, больш эфектыўныя формы і актыўна ўключаюцца ў іх правядзенне, асабліва калі яны адбываюцца ва ўмовах бібліятэкі.

Рыхтаваць творчую асобу магчыма толькі пры вырашэнні творчых задач. Таму на працягу апошніх 5 гадоў усе заняткі па тэме "Вызначэнне якасці сістэматычнага каталога і алфавітна-прадметнага паказальніка і эфектыўнасці іх выкарыстання" праводзіліся ў даведачна-бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі універсітэта. Заняткі праводзяцца ў форме дзелавой гульні. Для гэтага намі падрыхтаваны зборнік дзелавых гульняў, які мы шырока выкарыстоўваем на занятках. Студэнты з задавальненнем выконваюць ролі чытачоў, бібліятэкараў, экспертаў. Трэба бачыць іх твары на заключных занятках, калі падводзім вынікі дзелавой гульні. З упэўненасцю, перакананасцю і патрабавальнасцю даюць яны ацэнку сістэматычнаму каталогу (СК) і алфавітна-прадметнаму паказальніку (АПП), выкарыстоўваючы ўсе свае веды і практычны вопыт. Гэта адна з тэм, якая дае магчымасць пераканацца ў неабходнасці правядзення заняткаў у бібліятэцы. Студэнты даюць правільную ацэнку сістэматычнаму каталогу і алфавітна-прадметнаму паказальніку, і ёсць надзея, што гэтыя заняткі

будуць выкарыстаны імі не толькі для здачы экзамену, але і ў сваёй рабоце, таму што яны на занятках мелі магчымасць выявіць, як адлюстравана ў СК і АПП літаратура па такіх пытаннях, якія карыстаюцца вялікім попытам.

Сярод іх беларускі фальклор; вышэйшая адукацыя ў РБ і перспектывы яе развіцця; выкарыстанне ЭВМ у вучэбным працэсе; дзелавыя гульні ў вучэбным працэсе; маркетынг у бібліятэчнай справе; методыка самастойнага вывучэння беларускай мовы; палітычныя партыі Беларусі; правы грамадзян Рэспублікі Беларусь; шматузроўневая сістэма вышэйшай адукацыі ў РБ.

У выніку правядзення такіх заняткаў студэнты прафесійна робяць аналіз арганізацыі, вядзення і выкарыстання СК і АПП.

Так, вопыт работы на ФЗН сведчыць аб тым, што студэнты добра ставяцца да інавацыйных відаў заняткаў, асабліва тады, калі яны праводзяцца ва ўмовах бібліятэк. Іх зацікаўленасць тлумачыцца, па-першае, тым, што не ўсе яны былі ў буйных бібліятэках, па-другое, маецца магчымасць убачыць, як працуюць на рабочых месцах іх калегі, якія ў іх магчымасці, як выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі. Таму практычныя заняткі па тэме “Арганізацыя, вядзенне і выкарыстанне электроннага каталога (ЭК)” мы таксама праводзім у бібліятэцы. Тут некалькі прычын. Першая заключаецца ў тым, што гэтую тэму вывучаем раней, чым студэнты набудуць дастаткова ведаў па ЭВМ дзеля таго, каб змагчы карыстацца камп’ютэрам. У выніку за 4 гадзіны лабараторных заняткаў студэнты не змогуць зрабіць нават падраздзела ЭК. Мы лічым, што больш карысці яны будуць мець тады, калі непасрэдна ва ўмовах канкрэтнай бібліятэкі мы правядзём гэтыя заняткі. Студэнты аналізуюць, параўноўваюць, як выкарыстоўваецца тая ці іншая праграма, табліцы класіфікацыі ў якасці ІПМ, магчымасці ЭК, параўноўваюць выкарыстанне ЭК і традыцыйных каталогаў і г.д. Звычайна заняткі праводзяцца на базе такіх бібліятэк, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Рэспубліканская сельскагаспадарчая бібліятэка, Рэспубліканская бібліятэка па

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

фізкультуры і спорце, Цэнтральная дзіцячая бібліятэка г. Мінска і інш.

Вядома, гэта лепшы варыянт у нашых умовах. Але мы лічым, што лабараторныя заняткі ў колькасці 4 гадзіны не могуць задаволіць на сучасным этапе ні студэнтаў, ні выкладчыкаў. На наш погляд, неабходна або аднавіць курс "Сучасныя праблемы каталагізацыі", або для ўсіх студэнтаў ФЗН (усіх спецыялізацый) выкладаць курс "Аўтаматызаваная каталагізацыя", які ўжо чытаецца студэнтам дзённага аддзялення.

Трэба адзначыць, што адным з важнейшых відаў вучэбных заняткаў на ФЗН з'яўляецца лекцыя. Ёй надаецца належная ўвага, асабліва пры вывучэнні тэарэтычных раздзелаў курса ў сучасных умовах пры нездавальняючай забяспечанасці падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. Насычанасць лекцый па курсе "Каталагізацыя дакументаў" вялікая, бо ў адпаведнасці з праграмай мы разглядаем важныя пытанні нарматыўна-метадычнага забеспячэння каталагізацыі, тэарэтычных асноў індэксавання дакументаў, характарыстыкі табліц класіфікацыі, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэках Рэспублікі Беларусь, прадметызацыі дакументаў, тэарэтычных асноў стварэння каталогаў, машыначытальных (электронных) каталогаў, сістэмы каталогаў, якасці і эфектыўнасці іх выкарыстання, зводных каталогаў. Аб гэтым сведчыць тэматычны план курса.

Асаблівую ўвагу ў час лекцыі прыходзіцца звяртаць на складаныя тэарэтычныя пытанні курса, па якіх адчуваецца недахоп або адсутнасць матэрыялу. Аднак пры выкладанні тэарэтычнага матэрыялу ў студэнтаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй іншы раз бывае негатыўнае яго ўспрыманне. Даводзіцца тлумачыць, што на сучасным этапе нельга абмяжоўвацца практычнымі навыкамі, таму што да спецыяліста, які мае вышэйшую адукацыю, прад'яўляюцца вялікія патрабаванні. Неабходна, каб выпускнік вышэйшай школы меў не толькі высокія прафесійныя веды, але і мог кваліфікавана выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі і сучасныя віды аргтэхнікі, дакладна ведаць адну з замежных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

моў і свабодна валодаць дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь, умеў прымаць рэалістычныя рашэнні ў рамках цяперашняй палітычнай і эканамічнай мадэлі грамадства. Сучасны спецыяліст павінен арганічна спалучаць спецыялізацыю з шырокімі навуковымі поглядамі.

У лекцыі абавязкова падкрэсліваецца навізна матэрыялу і адначасова ўлічваецца тоўі падмурак у прафесіянальнай адукацыі, які навучэнцы атрымалі ў тэхнікуме. Разам з тым удакладняем, як атрыманыя веды будуць выкарыстаны на практыцы, абавязкова знаёмім з гісторыяй пытання, тлумачым новыя фармулёўкі тэрмінаў, знаёмім з рознымі поглядамі вучоных на адну і тую ж праблему. Па меры магчымасці стараемся рабіць усё неабходнае, каб лекцыя адпавядала сучасным навуковым патрабаванням і разам з тым была даступнай студэнтам і выклікала цікавасць да прадмета.

На наш погляд, пры вывучэнні тэарэтычных пытанняў лепш за ўсё выкарыстоўваць лекцыю ў выглядзе дыскусіі. Такая лекцыя-дыскусія мадэліруецца папярэдне. Пры гэтым улічваецца, што ў лекцыйным курсе акцэнтуюць увагу на пытаннях, па якіх няма адназначнага рашэння. Праўда, не на кожнай тэме і не ў кожнай групе можна правесці такую лекцыю, таму што яна патрабуе пэўнай падрыхтоўкі студэнтаў. У адрозненне ад семінара папярэдне студэнтам не даюць пытанні, а толькі ўказваюць тэму і літаратуру да яе. На нашым курсе такія лекцыі ўдаюцца на тэмах “ББК і яе выкарыстанне ў Рэспубліцы Беларусь”, ”Якасць каталогаў і эфектыўнасць іх выкарыстання”. На наш погляд, гэта магчыма таму, што студэнты частку ведаў атрымалі ў каледжы, параўноўваюць іх з практычным вопытам і разумеюць, што гэтыя веды яны будуць выкарыстоўваць у паўсядзённай рабоце.

Сказанае сведчыць аб тым, што на ФЗН неабходна шырэй выкарыстоўваць новыя тэхналогіі, а разам з тым прымяняць такія эфектыўныя формы работы, як дзелавыя гульні, параўнальны аналіз табліц класіфікацыі, вызначэнне

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

якасці і эфектыўнасці выкарыстання каталогаў канкрэтных бібліятэк і дыскусіі на лекцыйных, семінарскіх занятках.

***Мазанік В.У.**, выкладчык*

## АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКОЎ АРКЕСТРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ НА ФЗН У БЕЛАРУСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ

Сярод спецыяльных дысцыплін на факультэце завочнага навучання, мэта вывучэння якіх – падрыхтоўка кіраўнікоў аркестравага калектыву, адной з вядучых з'яўляецца дырыжыраванне. У сучасную пару існуе наступная сістэма падрыхтоўкі дырыжорскіх кадраў на дзённым і завочным аддзяленнях: сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (музычныя вучылішчы, вучылішчы мастацтваў), вышэйшыя навучальныя ўстановы (акадэмія музыкі, Беларускі універсітэт культуры), вышэйшая ступень дырыжорскай адукацыі – аспірантура-стажыроўка пры акадэміі музыкі. Такім чынам, склалася пэўная паслядоўнасць навучання, што і дазваляе рыхтаваць дырыжораў, кіраўнікоў аркестравых калектываў для прафесійных самадзейных аркестраў.

На факультэце завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры падрыхтоўка кіраўнікоў аркестравых калектываў ажыццяўляецца на кафедрах духавой музыкі, народна-інструментальнай творчасці. Асоба кіраўніка аркестра выхоўваецца ў выніку яго авалодвання комплексам спецыяльных дысцыплін. Апошні фарміруе ў студэнта веды, навыкі, адпаведныя здольнасці. Гэта вельмі неабходна для будучай працы па спецыяльнасці. Навучанне па спецыялізацыях ажыццяўляецца, між іншым, пры дапамозе розных форм вучэбнай работы - індывідуальных, групавых, калектыўных заняткаў.